
Удзел моладзі важны для пераемнасці традыцый


Свята Юр'я ў Обчыне Любанскага раёна

# Дакрануцца да неадчувальнага

## Як падтрымаць жыццё даўніх культурных практык у сучаснасці?

У Спіс нематэрыяльнай культурнай спадчыны чалавецтва UNESCO ад Беларусі ўключаныя пяць элементаў: абрад "Калядныя цары" ў вёсцы Семежава Мінскага раёна, урачыстасць у гонар шанавання Абраза Маці Божай Будслаўскай у вёсцы Будслаў Мядзельскага раёна, абрад "Юраўскі карагод" у вёсцы Пагост Жыткавіцкага раёна, культура ляснога бортніцтва і мастацтва саломапляцення.

"Неабходна павышэнне дасведчанасці ўдзельнікаў мясцовых супольнасцей аб традыцыях, якія існуюць у месцы іх жыхарства, забеспячэнне пераемнасці традыцыйных уменняў і навыкаў, заахвочванне моладзі да ўключэння ў справу зберажэння жывой спадчыны".

**У галерэі Беларускага саюза дызайнераў 17 мая адбылася лекцыя, прысвечаная канцэпцыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны і тэарэтычным ды практычным аспектам яе рэалізацыі ў Беларусі. Сустрэча прайшла ў рамках праекта кафедры культуралогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта "Культуралогія без межаў", перад прысутнымі выступіла вядучы спецыяліст Інстытута павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, адміністратар сайта "Жывая Спадчына" Алена Каліноўская.**

### АСНОВЫ АХОВЫ

Нематэрыяльная культурная спадчына — з'ява адносна новая, якая фактычна вылучылася толькі ў XXI стагоддзі. Канвенцыя UNESCO аб яе ахове была прынятая ў 2003 годзе, і сёлета да дваццацігоддзя гэтай падзеі ў нашай краіне, у тым ліку, запланаваны шэраг юбілейных мерапрыемстваў — між іншага, мусіць адбыцца тэматычная выстава на базе Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі.

Варта ўлічваць, што канвенцыя UNESCO па ахове матэрыяльнай культурнай спадчыны была прынятая яшчэ ў 1972, і спачатку праявы нематэрыяльнай спадчыны, якая ўвасабляецца людзьмі, а не канкрэтнымі прадметамі, таксама спрабавалі ўключаць у агульны спіс з архітэктурнымі помнікамі. Але пазней стала зразумела, што ў гэтым выпадку патрэбны асаблівы падыход.

Канвенцыя UNESCO 2003 года дае наступнае азначэнне нематэрыяльнай спадчыны: гэта культурныя практыкі, звычаі, традыцыі і формы іх праяўлення, якія прызнаюцца пэўнымі супольнасцямі як іх каштоўная культурная спадчына, што спрыяе фарміраванню іх ідэнтычнасці, і якую яны імкнуцца перадаць наступным пакаленням. Мэты канвенцыі — выклікаць павагу да нематэрыяльнай спадчыны, садзейнічаць падтрымцы яе жыццяздольнасці, а для гэтага — наладзіць міжнароднае супрацоўніцтва і дапамогу па яе ахове. Такім чынам, варта падкрэсліць, што каштоўнасць спадчыны вызначаюць самі супольнасці, а не пэўныя экспертныя колы, якія адно ідэнтыфікуюць і інвентарызуюць інфармацыю аб ёй.

Да нематэрыяльнай культурнай спадчыны могуць адносіцца фальклор, веды, навыкі і ўменні, звязаныя з народнымі рамёствамі, веды, якія адносяцца да прыроды і сусвету, праявы светапогляду, міфалогія і гэтак далей. Важным момантам пры гэтым з'яўляецца камунікацыя — то-бок заахвочванне да дыялогу і азнаямлення з культурай і традыцыямі розных супольнасцей, у тым ліку іх дробнымі штодзённымі праявамі.

Канвенцыя аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны, прынятая ў 2003 годзе, нездарма прадугледжвае выкарыстанне тэрміна "элемент", а не "аб'ект", бо ў гэтым выпадку мы маем справу не з аб'ектнасцю, а з комплекснасцю: сукупнасцю саміх нематэрыяльных праяўленняў творчасці чалавека, артэфактаў як прадуктаў гэтай творчасці, культурнай прасторы ды саміх людзей — і захавання патрабуе кожны з гэтых аспектаў. Асноўны фактар зберажэння жывой спадчыны палягае ў яе перадачы з пакалення ў пакаленне, яна існуе ў традыцыйным кантэксце, знішчэнне якога вядзе і да знікнення самога элемента. Нематэрыяльная спадчына мусіць пастаянна аднаўляцца супольнасцямі і фарміраваць пачуццё самабытнасці ды гонару. Таму так неабходна падтрымліваць лакальную ідэнтычнасць, якая забяспечвае кансалідацыю супольнасці і захаванне спадчыны, дапамагае падкрэсліць адрознасць ад іншых і зберагчы свае карані.

### СПІСЫ ДЫ ІНВЕНТАРЫ

Важнай задачай з'яўляецца таксама забеспячэнне жыццяздольнасці спадчыны, стварэнне ўмоў, пры якіх яна зможа быць захаванай і перададзенай наступным пакаленням, для чаго ладзяцца дакументаванне, даследаванне, папулярызацыя і перадача з дапамогай адукацыі. І, урэшце, краіны-ўдзельніцы канвенцыі складаюць уласныя спісы нематэрыяльнай спадчыны, якія мусяць звярнуць увагу грамадства да яе праяваў. Таксама UNESCO складае свой, агульны спіс сусветнай спадчыны, які падзелены на некалькі частак.

У рэпрэзентатыўны спіс уключаюцца з'явы, якія шырока распаўсюджаныя і практыкуюцца. У яго ўваходзяць, як правіла, тыя элементы, якім знікненне пагражае не ў гэткай ступені і якія маюць больш шырокае распаўсюджанне, нават на ўзроўні ўсёй краіны. Такія элементы часта робяцца нацыянальнымі брэндамі — як прыклады ў нашых умовах можна згадаць традыцыі саломапляцення альбо выцінанкі. Тым не менш такое маштабнае брэндзіраванне часам пагражае захаванню лакальных адметнасцей — калі ўніфікаваная традыцыя зберагаецца на агульнанацыянальным узроўні, але разам з тым губляюцца яе мясцовыя асаблівасці.


Гліняныя вырабы

Акрамя таго, існуе спіс элементаў, якія патрабуюць тэрміновай аховы. Менавіта гэты спіс з'яўляецца галоўным інструментам аховы нематэрыяльнай спадчыны, бо ў яго ўваходзяць, як правіла, элементы, якія маюць вельмі канкрэтныя лакацыі, распаўсюджаныя ў невялікіх супольнасцях. Ахова такіх праяў нематэрыяльнай спадчыны забяспечваецца шэрагам дакументаў — акрамя Усеагульнай дэкларацыі аб культурнай разнастайнасці, гэта таксама і Нагойскі пратакол аб абароне правоў носьбітаў генетычных рэсурсаў і традыцыйных ведаў і практык, і Канвенцыя аб біяразнастайнасці, у якой згадваецца аб існаванні традыцыйных ведаў і практык, звязаных з генетычнымі рэсурсамі, пад якімі разумеецца сукупнасць усіх жывых арганізмаў. Такім чынам, з генетычнымі рэсурсамі звязаны такія традыцыйныя практыкі, як бортніцтва, траўніцтва, рыбалоўства і г.д.

Акрамя канвенцыі, UNESCO распрацаваныя этычныя прынцыпы аховы нематэрыяльнай культурнай спадчыны. Перадусім гэта выклікана тым, што часта яе ахова не абумоўліваецца ніякімі юрыдычнымі нормамі, як у выпадку з матэрыяльнай. Важна звярнуць увагу, што ўдзельнікі супольнасці далучаюцца да гэтай дзейнасці пры ўмове іх вольнай папярэдняй беспераліннай інфармаванай згоды. Таксама нематэрыяльная культурная спадчына не падлягае вонкавай каштоўнаснай ацэнцы — то-бок ніхто са старонніх назіральнікаў не мусіць умешвацца ў ацэнку традыцый і ўказваць носьбітам, што і як яны мусяць рабіць. Акрамя таго, важна разумець, што нематэрыяльная культурная спадчына не абмяжоўваецца тымі элементамі, якім нададзены статус гісторыка-культурнай каштоўнасці, — спіс можа пашырацца.

Першай з праяў нематэрыяльнай спадчыны ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей быў уключаны абрад "Юраўскі карагод" — гэта адбылося ў 2004 годзе, затым у 2006-м туды дадалі абрад "Страла" з Веткаўскага раёна. Але сістэмная праца па выяўленні і інвентарызацыі нематэрыяльнай спадчыны ў Беларусі распачалася толькі ў 2009 годзе. З таго моманту пачалі праводзіцца тэматычныя семінары з супрацоўнікамі ўстаноў культуры ва ўсіх рэгіёнах. У выніку цягам наступных гадоў быў створаны Нацыянальны інвентар нематэрыяльнай культурнай спадчыны, які папаўняецца ад 2012 года.

Сёння статус гісторыка-культурнай . каштоўнасці маюць 168 элементаў, з іх 51 — геральдычныя і тапанімічныя аб'екты, а рэшта — непасрэдна жывыя традыцыі. Такім чынам, у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Беларусі знаходзіцца крыху больш за сотню элементаў нематэрыяльнай спадчыны — зрэшты, у 2015-м, напрыклад, іх было толькі 76. У апошнія гады дзейнасць па наданні статусу нематэрыяльнай каштоўнасці значна актывізавалася, і гэты пералік, вядома, будзе расці. Але важна разумець, што часам адзін элемент могуць падтрымліваць некалькі супольнасцей, а часам — нават дзясяткі па ўсёй краіне, і ў дзейнасць па іх захаванні могуць быць уцягнутыя сотні людзей. Найбольш шырока прадстаўлены ў спісе такія катэгорыі, як традыцыйныя рамёствы, выканальніцкія мастацтвы, традыцыйныя цырымоніі і абрады, цяпер актыўна пашыраецца катэгорыя традыцыйнай ежы.

## ФЕСТЫВАЛІ І АБРАДЫ

Апошнім часам у свеце ўсё большую папулярнасць набывае культурны турызм. Прыхільнікі такога кшталту адпачынку, як правіла, дужа патрабавальныя і чакаюць ад падарожжаў большага — але, паводле ацэнкі Сусветнай турыстычнай арганізацыі, такія турысты таксама і трацяць на траціну болей, дазваляючы культурным установам, якія яны наведваюць, болей зарабляць і ўстойліва развівацца. Усё болей прыхільнікаў знаходзіць таксама творчы турызм, што прадугледжвае актыўны ўдзел падарожнікаў, якія навучаюцца розным мастацкім ці рамесным практыкам, а ў выніку могуць, напрыклад, стварыць сувеніры ўласнымі рукамі.

Аналізуючы ўдалыя практыкі па выкарыстанні нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у турыстычнай дзейнасці, між мерапрыемстваў абласнога ўзроўню варта адзначыць фестываль "Скарбы Гродзеншчыны", канкрэтна прысвечаны нематэрыяльнай культурнай спадчыне. Перад кожным раёнам вобласці была пастаўленая задача адшукаць і даследаваць узоры жывой народнай культуры, і па выніках гэты фестываль адбываецца раз на два гады ў розных раёнах вобласці, што дазваляе ўключыць у яго правядзенне большую колькасць прадстаўнікоў мясцовых супольнасцей.


Святкаванне Стрэчання ў вёсцы Новае Палессе Лельчыцкага раёна

Рэспубліканскі фестываль фальклорнага мастацтва "Берагіня", які кожныя два гады ладзіцца ў гарадскім пасёлку Акцябрскі Гомельскай вобласці, — таксама добры прыклад работы па захаванні пераемнасці традыцыйнай народнай культуры, але, на жаль, ён у меншай ступені інтэграваны ў турыстычныя працэсы і таму амаль не мае гледачоў, акрамя жыхароў раёна. Цікавым прыкладам з'яўляецца і абрад "Бразгун" у Чэрыкаўскім раёне, падчас якога таксама адбываецца фальклорны фестываль, — але ў гэтым выпадку праблема палягае ў тым, што сам абрад пачынае знікаць, бо ў вёсцы папросту няма ўжо каму ўдзельнічаць у традыцыйным шэсці да крыніцы. У Слаўгарадскім раёне адбываецца даволі масавае свята "Блакітнай крыніцы" — але тут, у сваю чаргу, паўстае праблема непажаданай камерцыялізацыі спадчыны і нават узнікаюць пагрозы экалогіі, што ўжо неаднаразова адзначалася.

На ўзроўні раёнаў добрай формай па выкарыстанні нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў сферы турызму з'яўляюцца летнікі традыцыйнай культуры, якія спрыяюць засваенню народных традыцый, рамёстваў і ўменняў. Праўда, іх правядзенне патрабуе значнай падрыхтоўкі — доўгатэрміновае знаходжанне турыстаў у вёсцы і праграму іх побыту арганізаваць складаней, чым разавае мерапрыемства. Добрым прыкладам дзяржаўна-прыватнага партнёрства па арганізацыі такога кшталту летнікаў з'яўляецца фестываль традыцыйнай культуры "Пятровіца" ў Любанскім раёне — пры яго правядзенні культурную частку ладзяць спецыялісты ўстаноў культуры, гурты і носьбіты традыцый, а арганізацыйную частку забяспечваюць мясцовыя жыхары, пераемнікі гэтых традыцый, на сваіх асабістых падворках.

У Веткаўскім і Мастоўскім раёнах ладзяцца летнікі па стварэнні вырабаў на кроснах. Хоць гэта не масавыя і не надта публічныя мерапрыемствы, але надзейнасць прыцягнення турыстаў у такім выпадку забяспечваецца яшчэ лепш, бо асноўным крытэрыем якасці паслугі ў турызме з'яўляецца жаданне чалавека звярнуцца па яе яшчэ раз — і сюды госці насамрэч прыязджаюць неаднаразова. Зважым таксама на арганізацыю летнікаў, якія ладзяцца паўсюдна ў школах: пры іх правядзенні таксама можна прапанаваць для выкарыстання рэсурсы нематэрыяльнай спадчыны.

## ПРАБЛЕМЫ І ПЕРСПЕКТЫВЫ

У сферы захавання нематэрыяльнай спадчыны яшчэ застаецца багата актуальных пытанняў, вырашэнне якія патрабуе грунтоўнай працы. Неабходнае павышэнне дасведчанасці ўдзельнікаў мясцовых супольнасцей аб традыцыях, якія існуюць у месцы іх жыхарства, забеспячэнне пераемнасці традыцыйных уменняў і навыкаў, заахвочванне моладзі да ўключэння ў справу зберажэння жывой спадчыны.

Існуе таксама праблема дэградацыі элементаў спадчыны. Часам здараецца выкарыстанне падчас абрадаў неўласцівых форм адзення — напрыклад, пластыкавых вяночкаў пры святкаванні гукання вясны. Падобная сітуацыя існуе і з традыцыяй прыбіраць магілы на Радаўніцу, з якой на сённяшні момант таксама звязаная праблема пашырэння пластыкавых штучных кветак, што ўяўляюць пагрозу для экалогіі, бо засмечваюць прыроднае асяроддзе і не перапрацоўваюцца на працягу доўгіх гадоў, ствараючы сапраўдную экалагічную катастрофу. Такіх неадпаведнасцей варта пазбягаць, каб не страціць унікальныя праявы элементаў каштоўнасці.

Існуе таксама праблема захавання аўтарскіх правоў носьбітаў нематэрыяльных каштоўнасцей — элементы спадчыны могуць і мусяць сертыфікавацца і патэнтавацца, асабліва гэта тычыцца мясцовых традыцыйных прадуктаў харчавання і страў. Спецыялісты на месцах мусяць перадусім дбаць не аб унясенні ў спісы як мага большай колькасці элементаў нематэрыяльнай каштоўнасці, а аб забеспячэнні ўстойлівага развіцця і жыццядзейнасці традыцыйных практык — а для гэтага важна падключаць да ўдзелу ў захаванні нематэрыяльных каштоўнасцей мясцовую супольнасць.

Устойліваму развіццю і захаванню нематэрыяльных гісторыка-культурных каштоўнасцей у мясцінах іх бытавання можа істотна спрыяць выкарыстанне турыстычнага патэнцыялу — але пры ўмове, што сродкамі, накіраванымі на падтрыманне той ці іншай традыцыі, мусяць карыстацца менавіта іх носьбіты і захавальнікі, удзельнікі мясцовых супольнасцей. Разам з тым варта памятаць і аб рызыках, якія можа несці папулярызацыя жывой спадчыны, і пазбягаць яе фальклярызацыі, камерцыялізацыі ды брэндзіравання. Нематэрыяльная спадчына патрабуе далікатнага стаўлення, і захаваць яе магчыма адно супольнымі намаганнямі не толькі носьбітаў альбо работнікаў сферы культуры, адукацыі ці сродкаў масавай інфармацыі, але высілкамі ўсяго грамадства.

**Антон РУДАК**

Паводле матэрыялаў лекцыі

Ілюстрацыі (архіўныя фота): праявы нематэрыяльнай спадчыны


Стол на Масленку ў вёсцы Пагост Жыткавіцкага раёна


Саламяны павук